человеке такие необходимые черты характера, как нежность, доброту, милосердие, мечтательность; поэтому так важно не забывать об этом при подборе репертуара.

СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. Курсовая работа по педагогике https://revolution.allbest.ru/pedagogics/01198603_0.html
2. Дмитриев Г. П. Ударные инструменты : трактовка и современное состояние. — 2-е изд.. — М.: Советский композитор, 1991. — 145 с.
3. Попов С. С. Инструментоведение. — СПб: Издательство «Лань»; Издательство «ПЛАНЕТА МУЗЫКИ», 2019. — С. 273—320. — ISBN 978-5-4495-0075-5.
4. Рогаль-Левицкий Д. Р. Ударные инструменты // Современный оркестр. Том 2 из 4. — М.: МузГИз, 1953. — С. 312—446. — 447 с.
5. Рогаль-Левицкий Д. Р. Ударные инструменты (продолжение) // Современный оркестр. Том 3 из 4. — М.: МузГИз, 1956. — 356 с.
6. Рогаль-Левицкий Д. Р. Ударные инструменты // Беседы об оркестре. — М.: МузГИз, 1961. — С. 176—190. — 287 с.
7. Газарян С. С. Потомки камня // В мире музыкальных инструментов. — 2-е изд.. — М.: Просвещение, 1989. — С. 126—140. — 192 с.
8. Риман Х. Ударные инструменты // Музыкальный словарь. Том 3. — Москва-Лейпциг: П. Юргенсон, 1904. — С. 1295. — 480 с.
9. Ударные инструменты // Музыкальный энциклопедический словарь. — М.: Советская энциклопедия, 1990. — С. 560. — 672 с.

Рощина А.В., студент 350 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Лупашко И.Г.,
кандидат культурологии, доцент

# ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ ГІСТАРЫЧНЫХ МЯСЦІН СРОДКАМІ ТУРЫЗМА (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВЕЛАМАРШРУТА «ПАДАРОЖЖА ПА ГІСТАРЫЧНАЙ ЛІТВЕ»)

Перыяд сусветнай пандэміі віруса COVID-19 і ўнутрыпалітычны крызіс на некалькі год зачынілі магчымасць беларусаў вандраваць па планеце. Аднак сукупнасць такіх фактараў як “кавідныя” абмежаванні і немагчымасць трапіць па-за межы краіны стымулявалі развіццё ўнутранага турызму ў Беларусі. Гэта садзейнічала павышэнню попыта на недарагія туры па Беларусі. Разам з тым, ва ўсім свеце назіраюцца тэндэнцыі на змяншчэнне шкодных выкідаў у атмасферу і попыт на экалагічнасць. Калі сабраць у сукупнасць усе гэтыя фактары, то відавочна, што перспектыўным відам турызму можа стаць велатурызм. Зразумела, што гэта адзін з відаў актыўнага адпачынку і ён не падыходзіць для ўсіх катэгорый турыстаў, але так званая “мода” на здаровы лад жыцця, можа стымуляваць на наведванне гэтага маршрута моладзь.

*Прапаноўваемы веламаршрут.* Пры складанні маршруту варта было адзначыць не толькі аб’екты паказу, што будуць сустракацца вандроўнікам па маршруце, але і ўлічваць даступнасць інфраструктуры, ландшафт мясцовасці і фізічныя здольнасці турыстаў. Таму, арыентуючыся на сярэднестатыстычнага чалавека, было вырашана не рабіць пераезды болей, чым на 20 км. у дзень, з мажлівасцю наведвання па дарозе крамаў, кавярняў і гасцёўняў. Маршрут будзе праходзіць праз Смаргонскі, Ашмянскі, Іўеўскі і Воранаўскі раёны Гародзеншчыны: в. Залессе (Смаргонскі р-н) – в. Новаспаск – аг. Крэва – в. Чухны – в. Баруны (Ашмянскі р-н) – аг. Гальшаны – аг. Трабы (Іўеўскі р-н) – в. Жамыслаўль – аг. Геранёны – г. Воранава. Акрамя аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны турыстам будзе прапанавана наведаць прыватны музей у в.Чухны (Смаргонскі р-н), дзе размяшчаецца макет Крэўскага замка [1].

*Аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны на маршруце.* Пачаць наша падарожжа мы прапануем з даволі вядомага месца – маёнтка Агінскіх, што знаходзіцца ў в. Залессе на Смаргоншчыне. У палацы, які некалі належаў гэтаму роду, цяпер адкрыты музей, прысвечаны Міхалу Клеафасу Агінскаму, які акрамя сваёй творчай дзейнасці заклаў тут маляўнічы парк [6]. Да Залесся лёгка трапіць – гэтае мястэчка мае чыгуначнае спалучэнне з Вільняй і Мінскам – таму гэта найболей падыходзячая кропка для старта.

Наступныя пункты вандроўкі, за рэдкім выключэннем, знаходзяцца ў нявельмі прыгодным, мейсцамі аварыйным стане. Аднак, мы лічым магчымым з некаторымі абмежаваньнямі ўключыць іх ў веламаршрут. Гэта, на наш погляд, вырашыць адразу некалькі праблем – папулярызуе гэтую мясціну, прыцягне ў яе турыстаў, якія прынясуць сродкі на іх аднаўленне ў рэгіён. Варта адзначыць, што згодна з Дзяржаўным спісам гісторыка-культурных каштоўнасцей [5] толькі муры Крэўскага замка маюць 1 катэгорыю, аднак астатнія аб'екты таксама маюць значны турыстычны патэнцыял і вартыя наведвання.

У ходзе вандроўкі турыстамі будзе пераадолена каля 102,6 км за 6 дзён і акрамя ўжо раней адзначаных маёнтка Агінскіх у Залессі і муроў Крэўскага замка мы прапаноўваем наведаць такія аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны як:

- Былы базыльянскі касцёл у в. Новаспаск. У в. Новаспаск Смаргонскага раёна знаходзіцца былы базыльянскі манастырскі комплекс у стылі барока, пабудаваны яшчэ ў часы Рэчы Паспалітай. Па звестках за 1839 г. храм адносіўся да в. Суцькава і працаваў як праваслаўная Спаса-Праабражэнская царква. Калісьці ўнутры храм быў аздоблены беларускай рэззю. Храм вельмі пацярпеў падчас Першай Сусветнай вайны і больш не быў адноўлены. На вялікі жаль, на сённяшні дзень гэты аб'ект не знаходзіцца ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей і паступова знікае [5], [8], [10, str.258].

- Ансамбль былога манастыра базыльян у в. Баруны. Помнік знаходзіцца ў в. Баруны Ашмянскага раёну. Касцёл – галоўная разынка ансамблю – быў пабудаваны ў 1692 г., але пазней, у 1747-1753 гадах, быў перабудаваны па праэкту архітэктара А. Асікевіча ў стылі барока. У канцы XVIII ст. ля касцёла, што насіў імя Святых Апосталаў Пятра і Паўла, з'яўляецца манастырскі двухпавярховы корпус Т-падобнай формы. У др.п. XVIII ст. насупраць касцёла ўзведзена капліца, якая сярод мясцовых жыхароў мае назву "студэнцкай", бо ў міжваенныя часы у будынку манастырскага ансамбля месцілася Беларуская настаўніцкая семінарыя. На сённяшні дзень гэты ансамбль захаваўся цалкам і ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны. Варта адзначыць, што сам касцёл – дзейнічаючы і турысты змогуць яго наведаць [2], [5].

- Аграгарадок Гальшаны. У аг. Гальшаны, мы прапануем агледзець руіны былога замка Сапегаў з фрагментамі абарончых збудаванняў і ансамбль кляштару францысканцаў. Згодна з летапісам, замак існуе ў гэтых месцах па меншай меры з 1280 года і з'яўляецца радавым гняздом дынастыі Гальшанскіх. У 1525 годзе аб'ядналіся два буйных клана – Алена Гальшанская ажанілася з Паўлам Сапегам, які перабудаваў замак, зрабіўшы яго адным з найвялікшых ў ВКЛ. Непадалёк ад замка былі пабудаваны касцёл і кляштар каталіцкага ордэна францысканцаў. Архітэктурны ансамбль дажыў да нашых дзён, але, на вялікі жаль, у дужа занядбаным стане. Але з 2018 г. у замку вядзецца рэканструкцыя. Замак і ансамбаль кляштару францысканцаў прысутнічаюць ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурнай спадчыны [4], [5].

- Свята-Петра-Паўлаўская царква ў аг. Трабы. У аг. Трабы Іўеўскага раёна да нашых дзён захаваўся помнік народнага драўлянага дойлідства – Свята-Петра-Паўлаўская царква, пабудаваная ў 1784 годзе ў цэнтры вёскі. Вядома, што храм на гэтым месцы быў заснаваны яшчэ каля 1680 г., а сучасны воблік царква атрымала падчас перабудовы на мяжы XIX і

XX ст. Інтэр'ер аздабляе разны іканастас, што выкананы з пакрытага лакам маронага дуба ў два ярусы і раздзелены калонамі з разьбяным арнаментальным дэкорам, датаваным пач. 1900-х гадоў. Храм зафіксаваны ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурнай спадчыны [5], [9].

- Палацава-паркавы комплекс Умястоўскіх у в. Жамыслаўль. Нягледзячы на тое, што палац Умястоўскіх быў узведзены пазней – у 1870я гг. – комплекс з'яўляецца паменшанай копіяй палаца з варшаўскага сядзібна-паркавага комплексу Лазенкі, рэзідэнцыі караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў Варшаве. Паркавы комплекс тут быў закладзены яшчэ ў XVIII–XIX ст. Сядзіба Умястоўскіх занесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [5], [7].

- Аграгарадок Геранёны. Тут аб'ектамі паказу стануць касцёл св. Мікалая, пабудаваны ў 1529 г., а таксама руіны замка: ровы, земляныя валы і невялікія фрагменты каменных цыліндрычных вежаў. Сам Геранёнскі замак знакаміты тым, што менавіта ў тамтэйшых ваколіцах разгарнулася гісторыя кахання Жыгімонта Аўгуста і Барбары Радзівіл. Абодва помнікі занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [3], [5].

Прыбыўшы на апошні пункт нашай вандроўкі – г. Воранава – турысты змогуць адпачыць у гасцёўні і дачакацца цягніка дадому. Як і ў выпадку з в. Залессе, з якой пачынаецца маршрут, Воранава мае добрае чыгуначнае спалучэнне з Вільняй і Мінскам. Таму гэта найболей падыходзячае месца для фінішу вандроўкі.

Аб'екты, якія турыстам прапануецца агледзець па ходзе падарожжа, адносяцца да збудаванняў, створаных у перыяд ВКЛ, у тым ліку і падчас знаходжання яго ў складзе Рэчы Паспалітай, што дазваляе найпаўней раскрыць тэматыку нашага маршрута [5]. Цікавасць да гістарычнай спадчыны ў грамадстве, што назіраецца асабліва яскрава ў апошнія гады, можа прывабіць супольнасць да яго папулярызацыі. Гэта ў сваю чаргу

прыцягне ў гэты рэгіён сродкі, на якія можна будзе рэканструірваць альбо падтрымліваць у належным стане аб’екты, пералічаныя ў гэтым веламаршруце.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Бондаренко, С. Копия Кревского Замка [Электронный ресурс] / krevamuseum.business.site. – Режим доступа: https://krevamuseum.business.site/#summary. – Дата доступа : 13.03.2022.
2. Боруны: костел, мемориал экипажу самолета и кладбище солдат Первой мировой войны [Электронный ресурс] / strada.by , 2021. – Режим доступа: https://strada.by/story/boruny-kostel-memorial-i-kladbishche. – Дата доступа : 03.03.2022.
3. Гераненский замок — свидетель трагической истории любви Барбары Радзивилл (Часть 1) [Электронный ресурс] / Познай Беларусь. Блог о Беларуси, 2016. – Режим доступа: http://www.poznaibelarus.by/barbara_radzivill/. – Дата доступа : 06.03.2022.
4. Гісторыя і легенды Гальшанскага замка [Электронны рэсурс] / vetliva.by , 2020. – Рэжым доступу: https://vetliva.by/belarus/blog/istoriya-i-legendy-golshanskogo-zamka/. – Дата доступу : 05.03.2022
5. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс] / gosspisok.gov.by, 2022. – Рэжым доступу: http://gosspisok.gov.by/Home/Index?AspxAutoDetectCookieSupport=1. – Дата доступу : 06.03.2022.
6. Залесье [Электронный ресурс] / ekskursii.by , 2007-2022. – Режим доступа: https://ekskursii.by/?Goroda_Belarusi=213_Zalese – Дата доступа : 01.03.2022.
7. Палацава-паркавы комплекс Умястоўскіх у аграгарадку Жамыслаўль [Электронны рэсурс] / ГУК “Ивьевская районная библиотека”, 2022. – Рэжым

доступу: http://ivie-lib.by/pages/staradanya-zamk--syadzby--copy-1.htmlml. – Дата доступу : 06.03.2022.
8. Песенько, Е. Новоспасск [Электронный ресурс] / globustut.by, 2003. - Режим доступа: https://globustut.by/novospassk/. – Дата доступа : 02.03.2022.
9. Царква святых апосталаў Пятра і Паўла аг. Трабы [Электронны рэсурс] / ГУК "Ивьевская районная библиотека", 2022. – Рэжым доступу: http://ivie-lib.by/pages/carkva-svyatyh-apostala-pyatra--pala-v_-traby.html. – Дата доступу : 05.03.2022.
10. Jankowski Czesław. Powiat oszmiański : materjały do dziejów ziemi i ludzi(Część 1). – Petersburg: Księgarnia K.Grendyszynskego, 1896 r. – 391 str.

Савельева М.Д., студент 401 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Мицкевич Ю.В.,
кандидат педагогических наук, доцент

## ОСНОВНЫЕ ЭТАПЫ СОЗДАНИЯ РЕКЛАМНЫХ РОЛИКОВ: ТЕХНОЛОГИЧЕСКИЙ АСПЕКТ

В современном мире наблюдается рост интереса к созданию рекламных роликов. Рекламодатели стремятся найти оптимальные способы коммуникаций с целевой аудиторией и всё чаще обращают внимание на видео формат. Рекламные ролики на современном этапе содействуют не только ознакомлению потребителей с товарами, услугами, но и формированию мнений, поведения, определенного образа жизни целевой аудитории. Как считает Г.Г. Гольцов, рекламные ролики являются «одной из